Падтрымай "Вясну" на PATREON

Пратрусы па Беларусі, ліквідацыя БХК: хроніка пераследу 1 кастрычніка

дапоўнена

01.10.2021 **Тэгі**: пераслед, затрыманні

Праваабарончы цэнтр "Вясна" працягвае збіраць факты палітычнага пераследу ў Беларусі за пятніцу, 30 верасня. Рэпрэсіі не спыняюцца: беларусаў па-ранейшаму затрымліваюць, праводзяць пратрусы і ўжываюць іншыя формы ціску за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўлады.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:

- ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
- ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Масавыя затрыманні за каментары ў сацсетках: хроніка палітычнага пераследу 30 верасня

Спіс затрыманых 29-30 верасня

Праваабаронцам "Вясны" паведамілі пра затрыманне ў **Маскве** журналіста "Камсамольскай праўды ў Беларусі" **Генадзя Мажэйкі**. Імя Генадзя было ўказана пад артыкулам, у якой знаёмая забітага **Андрэя Зельцэра** станоўча пра яго адгукнулася. Праўладныя СМІ раскрытыкавалі «Камсамолку» за гэтую публікацыю, пазней сайт выдання заблакавалі беларускія ўлады.

Дапоўнена: як паведамляе "Комсомольская правда", днём 1 кастрычніка ў кватэры па месцы яго жыхарства прайшоў пратрус. Па словах маці Генадзя **Ірыны**, пратрус праводзілі супрацоўнікі КДБ, ён доўжыўся каля двух з паловай гадзін.

> *"У пастанове на пратрус пазначаны два артыкулы Крымінальнага кодэкса — арт. 130 ч. 3 (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці) і арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады). Пратрус праводзілі каля 7 чалавек. Таксама разам з імі былі двое панятых (супрацоўнікі сказалі, што гэта людзі, якіх сустрэлі на вуліцы),* — распавядае Ірына. — *Канфіскавалі флэш-назапашвальнікі, налепкі і значкі 2001-га года. Усё было ветліва".*

Генадзя падчас ператрусу дома не было. Як мяркуецца, у гэты час ён знаходзіўся на тэрыторыі Расіі.

> *"Апошні раз мы размаўлялі з сынам па відэасувязі днём 30 верасня. Тады ён быў у гасцініцы ў Маскве"*, — распавяла маці журналіста.

Уначы з 1 на 2 кастрычніка маці Генадзя патэлефанавалі і сказалі, што сын затрыманы і знаходзіцца ў ізалятары на Акрэсціна ў Мінску. Больш ніякай інфармацыі ў блізкіх журналіста няма.

У **Гродне** затрыманы **Дзяніс Зубрыцкі**. Дома ў яго адбыўся вобшук,

У **Мінску** стала вядома пра затрыманне 27-гадовага **Дзяніса Максімава**. Таксама ў Мінску затрыманы **Сяргей Сакавец**.

У **Ваўкавыску** быў затрыманы **Ігар Вераціла**.

У **Гомелі** быў затрыманы **Канстанцін Прусаў**.

У **Віцебску** быў затрыманы **Яўген Гуцалаў**. На яго быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні.

Паводле інфармацыі "Спісы затрыманых" 1 кастрычніка ў **Мінску** таксама былі затрыманыя:

- **Беладзед Аляксандр**
- **Бухаўцаў Вадзім**
- **Бушык Сяргей**
- **Быкоўская Святлана**
- **Качагараў Андрэй**
- **Кракасевіч Дзмітрый**
- **Станкевіч Аляксандр**
- **Старацітароў Васіль**
- **Юдэнка Яўген**

Вярхоўны суд ліквідаваў Беларускі Хельсінкскі Камітэт

Падставай для ліквідацыі стала «грубае парушэнне заканадаўства» з боку БХК. Паводле заявы, Міністэрствам юстыцыі ў выніку следчых дзеянняў у неназванай крымінальнай справе былі атрыманыя дакументы на двух чалавек, якім БХК нібыта аплаціў ганарары за «паслугі ў доўгатэрміновым назіраньні за выбарамі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь 2020 году».

У пацверджанне гэтаму Міністэрства юстыцыі прыклала да заявы копіі шэсць дакумэнтаў: дамоваў, прыходна-касавых ордэраў і актаў прыёму і перадачы.

У БХК заявілі, што ім невядома, аб якой крымінальнай справе і ў дачыненні да каго ідзе гаворка:

> *«Відавочна, што выкарыстоўваць матэрыялы крымінальнай справы, якія яшчэ не ацэньваліся судом у рамках судовага разбору ў крымінальнай справе, неправамерна. Гаворачы юрыдычнай мовай, калі Вярхоўны суд прызнае, што гэтыя дакумэнты, прычым толькі ў копіях, адпавядаюць рэчаіснасці, то гэтае рашэнне будзе мець прэюдыцыяльнае значэнне для крымінальнай справы, у якой знаходзяцца гэтыя дакумэнты і па якім абвінавачваюцца канкрэтныя людзі.*
>
> *Прэюдыцыя — абавязковасьць для ўсіх судоў, якія разглядаюць справу, прыняць без праверкі доказаў факты, раней устаноўленыя судовым рашэннем у іншай справе, якое набыло законную моц. Г. зн. гэта рашэнне будзе абавязковым для іншага суду ў крымінальнай справе. Такім чынам, рашэнне Вярхоўнага Суду ў справе аб ліквідацыі Беларускага Хельсінскага камітэту можа парушыць права на абарону людзей, якія праходзяць у крымінальнай справе»,*— заявілі ў БХК перад пачаткам працэсу аб лікідацыі арганізацыі.

У Бабруйску зноў ператрусы

Раніцай 1 кастрычніка ў Бабруйску сілавікі прыйшлі з ператрусам да мясцовай актывісткі і кіраўніцы бабруйскай філіі прафсаюзу РЭП **Галіны Смірновай**. Пасля ператрусу яе затрымалі, але ў межах якой справы і ў якім статусе — пакуль невядома.



Галіна Смірнова. Фота: svaboda.org

Верагодна, ператрусы праходзяць і ў яшчэ некалькіх бабруйчанінаў — яны не выходзяць на сувязь.

Стала вядома, што затрыманыя пасля ператрусу актывістка Галіна Смірнова знаходзіцца на допыце КДБ. Там жа дапытваюць 38-гадовага бабруйчаніна **Сяргей Бяляева** і **Вольгу Новікаву**.

Сяргея, які мае трэцюю групу інваліднасці (у яго хвароба Паркінсона) затрымлівалі на Дзень Волі і арыштавалі на 20 сутак. Каля тыдня ён галадаў, адмаўляючыся ня толькі есці, але і прымаць прапісаныя лекі. На галадоўку Сяргей наважыўся пасля таго, як супрацоўнікі бабруйскага ІЧУ забралі ў яго матчыну перадачу. Створаныя для асуджаных за Дзень Волі ўмовы ў ізалятары мужчына называў катаваннем.

На "хімію" адпраўляюць дубровенскага актывіста Міхаіла Чамураку



Міхаіл Чамурака. Фота: Беларускае Радыё Рацыя.

Дубровенскага актывіста АГП **Міхаіла Чамураку**, якога асудзілі да трох гадоў "хіміі" па арт. 188 КК за паклёп у адносінах да супрацоўніка аршанскага ДАІ **Казакова**, адпраўляюць адбываць пакаранне ва ўстанову адкрытага тыпу №29 у Ваўкавыску. Ён мусіць туды прыбыць да 3 кастрычніка.

Тэлеграм-канал і YouTube-канал "Усы Лукашенко" прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі.

Такое рашэнне прыняў суд Маскоўскага раёна Мінску 20 верасня 2021 года.

Таксама тэлеграм-чат «Глубокое для жизни» прызнаны экстрэмісцкім.

Пратрусы ў непаўналетніх на Брэстчыне з-за надпісу на прыпынку

Як паведамляюць берасцейскія праваабаронцы, днямі прайшлі пратрусы ў **васьмі дамах** у вёсцы Кавердзякі з-за надпісу "Жыве Беларусь" на прыпынку, пакінутай у ноч з 22 на 23 верасня. Шэраг грамадзян, пераважна непаўналетніх, падвергліся допытам — падзея надзвычайная для маленькай вёскі. Супрацоўнікі органаў прасілі згоду бацькоў на допыт без іх удзелу, даючы на роздум літаральна дзесяць хвілін.

У відэааператара ў Мінску, які супрацоўнічаў з DW, прайшоў пратрус па справе аб тэрарызме



Ягор Камароўскі. Фота: DW

У відэааператара **Ягора Камароўскага**, які супрацоўнічаў з DW, прайшоў пратрус па справе аб "акце тэрарызму". За два дні да гэтага Камароўскага прысудзілі да адміністрацыйнага арышту за "хуліганства".

Пра гэта паведаміў DW бацька журналіста **Сяргей Камароўскі**. Паводле яго слоў, у пастанове аб ператрусе пазначаны артыкула крымінальнага кодэкса - "Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці", а таксама - "Акт тэрарызму".

У працэсе ператрусу на кватэры ў відэааператара ў Мінску канфіскавалі ўсю тэхніку, уключаючы ноўтбук, відэакамеры, якія запісваюць прылады і карты памяці, а таксама пасведчанне пазаштатнага супрацоўніка Deutsche Welle. Разам з тым, як адзначыў бацька Камароўскага, афіцыйна ні падазрэнне, ні абвінавачванне па крымінальнай справе Ягору Камароўскаму пакуль не прад'яўленыя.

У цяперашні час Ягор Камароўскі знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання на завулку Акрэсціна ў Мінску. Ён быў затрыманы ўвечары 28 верасня ў Мінску, пра што паспеў паведаміць сваякам. На наступны дзень яго асудзілі на 14 сутак адміністрацыйнага арышту за "хуліганства"

Інфармацыя дапаўняецца і абнаўляецца.

Твитнуть






Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

ГАЛОЎНАЕ



Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY